Академическая с композиционным акцентом на здание Президиума.

3. Отсутствует единый архитектурный ансамбль всего комплекса Академии на данном участке, на что указывал в своей известной книге «История архитектуры Белоруссии» (советский период) еще А.А. Воинов: «… ансамбля не получилось. Этот недостаток и после войны, при восстановлении этих зданий не был устранен» [2, с. 38]

4. Доминантное градоформирующее положение Главного корпуса НАН РБ выходящего на пр. Независимости и ул. Академическую, во многом определяющее архитектурный образ этого участка проспекта Независимости как одного из символов архитектуры г. Минска.

*Литература*

1. *Архітэктура Беларусі: нарысы эвалюцыі ва усходнеславянскім і еўрапейскім кантэксце. У 4 т. т. 4. Кн. 2. Архітэктура XX – пачатку XXI ст./ А.І. Лакотка і інш. – Мінск: Бел. навука. 2009.*

2. *Воинов А.А. История архитектуры Белоруссии (советский период). Мн.: Выш. школа. 1975.*

3. *Воинов А.А. И.Г. Лангбард. Мн.: Выш. школа. 1976.*

4. *Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінск: Бел СЭ. 1988.*

5. *Лакотка А.І. Нацыянальныя рысы беларускай архітэктуры. Мінск: Ураджай. 1999.*

6. *Шамрук А.С. Архитектура Беларуси XX – начала XXI в.: эволюция стилей и художественных концепций. Мн.: Бел. навука. 2007.*

*Архивные источники*

*Белорусский государственный архив научно-технической документации. Ф. 3, оп. 1, дела 459, 461, 478, 484, 493*

**ARCHITECTURE ACADEMY: CONTINUITY AND DEVELOPMENT**

***Sardarov Armen, Bascharimova Tatsiana***
**Belarusian National Technical University**

Architecture of main buildings of Byelorussian academy in Minsk had a long evolution, which followed by country's political and cultural history. This article based on historical investigation which was made during the design works of reconstruction of Academy made by AIC NICH BNTU.

*Поступила в редакцию 12.02.2016 г.*

УДК 711.424 (476)

# ГОРАД СУЧАСНЫ І ГОРАД БУДУЧЫ (ПА ІНВЕНТАРУ КАРЭЛІЧ 1672 Г.)

**Сергачоў С. А.**
доктар архітэктуры, загадчык кафедры «Архітэктура жылых і грамадскіх будынкаў», БНТУ

*Аналіз інвентара Карэліч 1672 г., – раённага цэнтра ў Гродзенскай вобласці, а тады маёмасці Радзівілаў, паказвае тыпічныя працэсы развіцця архітэктуры Беларусі таго часу і асаблівасці, уласцівыя менавіта гэтаму гораду. Адначасова інвентар з’яўляецца творам мастацтва, у якім ў звыклай да сярэднявечча манеры, паказаны воблік горада таго часу і, па ўяўленню мастака, вобраз Карэліч у будучыні.*

*Уводзіны.* Даследаванні архітэктуры Беларусі дазволілі аднесці [1, с. 102] Карэлічы да гарадоў, дзе прынцыпы рэгулярнай забудовы, прыкладна ў XVI – першай палове XVII стст., выкарыстаны фрагментарна, закранулі частку паселішча. У далейшым горад развіваўся ў адпаведнасці з ідэалогіяй сярэднявечча, з імкненнем да ўпарадкавання і паляпшэння. Класічную сістэму, – прамавугольная ў плане рыначная плошча з васямью вуліцамі, што адыходзілі ад яе вуглоў, Карэлічы не атрымалі. Але рэгулярную забудову тут зрабілі з прыстасаваннем да існуючай сітуацы і з улікам патрабаванняў эканамікі.

Асноўная частка. Карэлічы, як патрабавалі тыя часы, займалі зручнае для абароны месца: натуральныя перашкоды, – навакол балоты, рака Руціца (зараз Рута), крутасць рэльефу. Месца для горада адпавядала развіццю гаспадарчай і гандлёвай дзейнасці: добраякасныя глебы, гандлёвы шлях з паўдня на поўнач, да старадаўніх сталіц Навагрудак і Вільня. Горад узвышаецца над рачной далінай, – паўднёвая частка плошчы больш чым на 12 м, а паўночная, дзе стаіць царква, – на 18 м. Круты схіл рэльефу ў бок даліны Руціцы быў істотна ўплываў на

планіроўку горада, якая адлюстравана ў гаспадарчых дакументах – інвентарах.

Інвентар Карэліч 1672 г. (мал. 1):, у якім паселішча завецца і горадам, і мястэчкам, [2, арк. 8–14] паказвае асаблівасці забудовы, а пры параўнанні з папярэднім інвентаром за 1646 г. [3, арк.1–3] выяўляе тэндэнцыі развіцця гэтага горада пасля завяршэння вайны пачатку другой паловы XVII ст.



Мал. 1. Аркуш 1 інвентара маёмасці Карэлічы. 1672 г.

Параўнальнае даследаванне гаспадарчых дакументаў па маёнтку Карэлічы дазволіла ўдакладніць характарыстыку планіровачнай структуры горада, яго забудовы, асобных будынкаў. Яно складалася з параўнання ўласцівасцей аб’ектаў (вуліцы, рыначная плошча, панскі двор, будынкі, памеры мяшчанскіх пляцаў, прозвішчы мяшчан і інш.) і пошуку таго, якія з іх супадаюць ці адрозніваюцца ў інвентарах XVII ст.

Асноўныя вынікі:

Пры складанні інвентароў гарадоў і мястэчак у XVI–XVIII стст. рабілі не проста пералік пляцаў і іх памераў у квадратных прутах (1 кв. прут = 23,7 м$^2$). Кожны пляц азначалі як структурную адзінку вуліцы, завулка ці плошчы. Паказвалі, на якой старане вуліцы ён знаходзіцца, каб вызначыць яго горадабудаўнічую значнасць і эканамічны патэнцыял. Таму запісы пра вуліцу рабілі з прывязкай да элементаў горада – рынка, магістральнай вуліцы, става, ракі, гарадской брамы, царквы і інш. Напрыклад, пра Ашмяны (1668 г.): “Вуліца Жупранская з Рынку па правай руцэ” і “Другая старана да Рынку”. Запіс мог быць сціплым (Ішкалдзь, 1603 г.): “Вуліца Барацінская” і “Другая старана той вуліцы”. Гэта азначала пералік пляцаў па розных старанах вуліцы.

1. Калі пералік ішоў без успамін пра стораны, гэта сведчыла, што пляцы ёсць толькі на адной старане вуліцы.

Узвышша, якое займаюць Карэлічы, арыянтавана так, што дамы з выгаднай арыентацыяй на поўднёвы напрамак можна паставіць толькі па адной старане вуліцы. Калі ставіць на супраціўнай старане, то вокны былі б павернуты амаль на поўнач, што дрэнна, гэтага заўсёды пазбягалі. Таму, можна дапусціць, што вуліцы ў Карэлічах былі спецыяльна трасіраваны так, каб забудова была арыентавана толькі на спрыяльную старану. Горадабудаўнічая сітуацыя, калі ўвесь горад быў створаны з улікам экалагічных і энергаэфектыўных прынцыпаў шляхам найбольш выгаднай арыентацыі жылых дамоў, выключная, рэдкасная для старадаўняй Беларусі.

Гэта і было зафіксавана ў інвентары Карэліч 1672 г. Аднабаковую забудову мелі ўсе вуліцы, акрамя Маставой, але і там двухбаковасць была адноснай. На другім яе баку было не больш за дзве сядзібы: у 1672 г. – пляц памерам 5 кв. прутоў, а другі, – 11 кв. прутоў быў “пу-

сты”, незаняты. Гэтыя пляцы знаходзіліся каля млына, на адным з іх жыў млынар.

2. У 1672 г. было шэсць вуліц: Папоўская, Дворная, Крывая, Запольная, Маставая, Сярэдняя, – на адну больш, чым у 1646 г. (табл. 1). Назвы вуліцы “Вшывая”, якую можна знайсці ў выданнях пра Карэлічы [4, с. 177], ніколі не было. Прыватныя прыкметы почырка служачага – выканаўцы інвентара 1646 г., тэхніка напісання літараў, рух прылады пісьма, парадак выпісвання элементаў, метады параўнальнага даследавання інвентароў, паказалі, што назва “Вшывая” з’явілася пры памылковым прачытанні сапраўднай назвы гэтай вуліцы на польскай мове – “Крывая”.

| Назва вуліцы | Год | | |
|---|---|---|---|
| | 1646 | **1672** | 1681 |
| **Папоўская** (зараз Паркавая) | + | + | + |
| **Дворная** (зараз не існуе) | + | + | + |
| **Крывая** (зараз 8-га Сакавіка) | + | + | + |
| **Запольная** (зараз Школьная, існуе часткова) | + | + | + |
| **Маставая** (зараз 17-га Верасня) | + | + | + |
| **Сярэдняя** (зараз Савецкая) | – | + | + |

Табліца 1 – Назвы вуліц Карэліч у інвентарах XVII ст.

З’яўленне ў інвентары 1672 г. вуліцы пад назвай “Сярэдняя” выклікана не толькі павелічэннем горада. Сказалася і імкненне зрабіць асяроддзе лепш прыстасаваным для жыцця. Горад атрымаў лепшы пад’ём з рачной даліны да рынка (мал. 2, 3).

Падоўжны ўхіл тут быў значна меншы (каля 6 %), чым на старым шляху па вул. Маставой (12 %). Праехаць у горад стала лягчэй. Назву новая вуліца атрымала, мабыць, ад таго, што была, калі глядзець з рынка, пасярэдзіне паміж старадаўнімі вуліцамі – Запольнай і Маставой.




Мал. 2. Рэканструкцыя схемы планіровачнай арганізацыі Карэліч. 1672 г.:
I – рыначная плошча; II – двор; III – стаў:
1 – першая кватэра рынка; 2 – другая кватэра;
3 – трэцяя кватэра; 4 – чацвёртая кватэра;
5 – вул. Руціцкая; 6 – вул. Дворная; 7 – вул. Крывая; 8 – вул. Запольная; 9 – вул. Сярэдняя;
10 – вул. Маставая; 11 – дарога да млына (з’явіцца ў XVIII ст.);
12 – ратуша (з’явіцца ў XVIII ст.);
13 – царква; 14 – сінагога; 15 – млын



Мал. 3. Пад’ём па вул. Сярэдняй на рыначную плошчу. Зараз вул. Савецкая

3. Прайшло пяць гадоў, як скончылася вайна, а ў інвентары 1672 г. вынікі разбурэнняў ужо не адчуваюцца, “пусты” пляц усяго адзін, каля млына. У параўнанні з даваенным часам колькасць дымоў (падаткаабкладаемых аддзінак) у Карэлічах значна павялічылася (табл. 2). У цэнтры мястэчка павелічэнне было найбольшым.

| Дымы | Гады | | |
|---|---|---|---|
| | 1646 | 1672 – | % да 1646 г. |
| **Рыначныя** | 15 | 34 | 226,6 |
| **Вулічныя** | 43 | 65 | 151,2 |
| Усяго | 58 | 99 | 170,7 |

Табліца 2 – Параўнанне колькасці дымоў
у Карэлічах. XVII ст.

4. Плошча, што вылучылі на сядзібныя пляцы, так значна не ўзрасла: пры росце колькасці дымоў на 70,7 %, – усяго на 16,8 %, (табл. 3). Памеры пляцаў сталі меншыя, будынкі сталі займаць большую плошчу на ўчастках, адпаведна зменшыліся адлегласці паміж пабудовамі. Шчыльнасцьзабудовы, перш за ўсё цэнтра горада, павінна была ўзрасці.

Рост горада рэгулявалі, у асноўным, пераразмеркаваннем памераў пляцаў, – яны істотна зменшыліся на Дворнай, Крывой і Запольнай вуліцах. На новай вул. Сярэдняй змесцілі яшчэ 16 невялікіх пляцаў, – у большасці па 3 кв. пруты.

| Год | Плошча сядзібных пляцаў (у кв. прутах) | | |
|---|---|---|---|
| | Платныя | Вольныя | Усяго |
| **1646** | 508,66 | 62 | 570,6 6 |
| **1672** | 538,5 | 128,07 | 666,5 7 |
| % росту | 5,9 | 106,6 | 16,8 |

Табліца 3 – Параўнанне памераў сядзібных пляцаў
у Карэлічах. XVII ст.

Такія пляцы рабілі забудову больш канцэнтраванай, не дазвалялі павялічваць тэрыторыю горада і тым самым не давалі мяшчанам магчымасць развіваць сельскагаспадарчую дзейнасць. Горад заставаўся кампактным, вырашаць справы ў ім можна было хутка і эканомна.

5. Акрамя сядзібных пляцаў мяшчане за асобную аплату бралі ў карыстанне ворную зямлю (“валокі гарадскія”, валока – адзінка плошчы = 21,36 га), зямлю на сенакосы і агароды, на гумно, участкі лесу. “Валокі” былі побач з горадам, у адрозненне ад “моргаў гарадскіх”, – таксама ворная зямля, але саступала па якасці і знаходзілася на адлегласці.

Даход феадала ад ворнай зямлі быў значна большы, чым ад сядзібных пляцаў (табл. 4). У 1646 г. такіх валок было 14, у 1672 г. стала 15. Але павелічэнне на 7,1 % не паспявала за ростам колькасці дымоў горада, – на 70,7 %. Аддаваць валокі пад забудову феадалу было не выгадна. Але меўся яго інтарэс і да павелічэння колькасці жыхароў, што спрыяла развіццю фінансава-гандлёвай дзейнасці ў яго валоданнях. Гэтую супярэчнасць вырашалі ўшчыльненнем забудовы, каб размясціць новых гараджан. А каб яны згадзіліся жыць у Карэлічах, давалі ільготу – “вольны” ад падатка пляц.

| Год | Даход з гарадскіх пляцаў | Даход з валок гарадскіх |
|---|---|---|
| **1646** | 21 злоты 4 гроша | 228 злотых 10 грошаў |
| **1672** | 19 злотых 2 грошы | 211 злотых 3 грошы |

Табліца 4 – Памеры даходу з Карэліч. XVII ст.

Але даходы феадала, яшчэ і ад “моргаў сенажатных” – 13 злотых, ад “моргаў лясных” – 52 злотых, “моргаў пахатных” – 43 злотых, не ішлі ў параўнанне з даходамі ад здачы ў арэнду корчмаў і млыноў (у 1646 г. – 700 злотых). І гэта ўжо быў вынік існавання ў горадзе асяроддзя для фінансава-гандлёвай дзейнасці.

6. У параўнані з 1642 г. у горадзе стала ў два разы больш вольных пляцаў, – вынік эканамічнай палітыкі уладальніка горада. Але гэта вынік і пэўнай арганізацыйнай працы па стварэнню канкрэтнага сацыяльнага саслоўя, бо вольнымі пляцамі валодалі мяшчане, набліжаныя да ўлады: войт, ляснічы, вайсковыя людзі (падвойскі, харунжы, драгуны), свяшчэннік, карчмар, арандатар, дворны каваль, лоўчы, піавар і інш. Расслаенне гараджан на сацыяльныя групы ў далейшым спрыяла стварэнню гарадскога асяроддзя і будынкаў з больш якаснымі архітэктурна-мастацкімі і канструктыўнымі асаблівасцямі, з добраўпарадкаваннем.

7. Прынцыпы рэгулярнай планіроўкі рэалізаваліся і праз сістэмнасць памераў пляцаў мяшчан. Інвентар паказвае, што плошча ў 15 кв. прутоў (355,5 м$^2$) была калісьці стандартным пляцам. Такі памер універсальны, дазваляў падзяліць пляц па розных сістэмах счыслення, як па двaічнай (½ = 7 ½ кв. прута; ¼ = 3 ¾; $^1/_8$ = 1 $^7/_8$; $^1/_{16}$ = $^5/_8$ кв. прута), так і па траічнай ($^1/_3$ = 5 кв. прутов, $^1/_6$ = 2 ½; $^1/_{12}$ = 1 ¼). Такіх пляцаў была значная большасць у горадзе, яны выкарыстаны пры размеркаванні рыначнай плошчы, акрамя чацвёртай кватэры, і вул. Папоўская, Крывая, Маставая.

Чацвёртая кватэра, якую фарміравалі дом скарбовы, карчма ("даўна збудавана"), царква (мал. 4) са званіцай ("пляц царкоўны агароджаны пілаванымі дошкамі") і некалькі мяшчанскіх пляцаў, мела іншую сістэму размеркавання (2;3; 6 кв. прутоў), –сведчанне старадаўняй планіроўкі. Некрануты былі, мабыць, і вул. Дворная і Запольная (пляцы у 3 ¼, 6 ½, 13 кв. прутоў).

Большасць іх жыхароў займалася абслугай панскага двара, магчыма, таму памеры іх пляцаў не пераглядаліся.

8. Панскі двор, – фактычна ўжо асяродак гаспадарчай дзейнасці, знаходзіўся бліжэй да ракі, за горадам, злучаўся з ім вул. Дворнай і дзяліўся на парадную і гаспадарчую часткі. Мелася мноства гаспадарчых пабудоў: бліжэй да дварца скляпы, кухні, свірны, спіхлеж, кухня, сырнік (пад ім – турма) і інш., далей – гумнішча.

Цікава было каля рэчкі: бровар, лазня, "сажалка пры рацэ нова зробленая", "скрыня нова зробленая з дрэва для рыбы", млыны два – "стары" з двумя коламі, другі з адным. Быў і той самы парк, што вядомы як "італьянскі" яшчэ ў інвентары 1646 г., хаця памылкова датай яго заснавання лічіцца 1686 г. [5, с. 41].



Мал. 4. Царква св. Апосталаў Пятра і Паўла (1866 г.) на старадаўнім "царкоўным пляцы". Злева – выхад на рынак Крывой вуліцы (зараз – вул. 8 Сакавіка)

9. Інвентар Карэліч 1672 г., складзены рэвізорам княстваў Слуцкага і Капыльскага Ежы Янам Бярновічам, акрамя гістарычнай значнасці, мае каштоўнасць і для мастацкай культуры Беларусі (мал. 5–8).



Мал. 5. Ініцыял "I" на аркушы 1 інвентара

Невялікія мініяцюры вылучаюць чатыры пачатковыя літары (з улікам лацінскай палеаграфіі, –ініцыялы), якімі аздобілі пачатак раздзелаў. Кожная мініяцюра – графічная фантазія на тэму "горад" ва ўяўленні мастака XVII ст.



Мал. 6. Ініцыял “W” на аркушы 3 інвентара

Ініцыял “I” – пачатак слова “Інвентар”, аздоблены панарамай гарадской забудовы, якая знаходзіцца на ўзвышшы, а Карэлічы і размяшчаюцца на рэльефе. У цэнтры малюнка вялікі будынак, хутчэй за ўсё, панскі дом; злева, абнесены агароджай гаспадарчы комплекс.



Мал. 7. Ініцыял “S” на аркушы 48 інвентара

Шчыльна стаяць дамы з уваходамі з тарца, нагадваючы шэрагі крам на рынку. Большасць дамоў з ўваходам з вулічнага фасада, – асаблівасць жылля гандляроў і рамеснікаў. На ўскрайку групка дамоў, якія не маюць дзвярэй на тарцовым фасадзе, – так і было на перыферыі горада, дзе займаліся і сельскай гаспадаркай. На ўзгорку – абарончая сцяна, за ёй будынкі гарадского цэнтра. Вышэй – будынак з вежай, магчыма ратуша.



Мал. 8. Ініцыял “T” на аркушы 49 інвентара

Прызнаць гэтую і іншыя мініяцюры выявамі Карэліч XVII ст. нельга. Мастак паказаў ідэалізавы воблік горада, магчыма пажаданы вобраз Карэліч, які калісьці будзе: з абарончымі сценамі і вежамі, з мноствам храмаў і іншых будынкаў. Гэта быў звычайны прыём мастацтва таго часу, калі на адной карціне паказвалі падзеі з розных часоў. Маглі выкарыстоўвацца і пазнаваемыя краявіды Карэліч, складаны рэльеф, канкрэтныя фрагменты забудовы горада. Так, у ініцыяле “W” будынак царквы знаходзіцца амаль што на самым высокім узроўні рэльефа, як і ў Карэлічах. Ініцыял “S” выразна адлюстроўвае аднабаковую забудову вуліц. У ініцыяле “T” царква мае канкрэтныя асаблівасці архітэктуры: падоўжная кампазіцыя, купал, званіца са шпілем. Агульным для мініяцюр з’яўляецца выкарыстанне ў вобразах-алегорыях панарам забудовы на стромкім рэльефе, шэрагавая пастанова дамоў, арыентацыя іх на адзін бок свету, як, магчыма, і было ў Карэлічах. Тэхнічныя асаблівасці графічных выяў дрэў, паверхні зямлі, дамоў характэрныя другой палове XVII ст. – мастак А. Тара-

севіч, які працаваў тады ў Глуску і Слуцку [6, с. 171].

Літары ініцыялаў, мабыць, зроблены потым і ўстаўлены паверх малюнка. Гэтае магчыма палічыць на падставе кампазіцый-ных пралікаў, літара ў цэнтры малюнка не заўсёды ўдала дапасавана да кампазіцыі.

Заключэнне. Карэлічы, якім не адводзілася значнага месца пры аналізе працэсаў развіцця архітэктуры на Беларусі, маюць магчымасць многае тыпічнае для старадаўніх часоў паказаць захаваным, як у старадаўніх дакументах, так і на свае вочы, тым больш, што яно выкарыстоўваецца ў сёняшняй планіровачнай структуры горада. Мастацкія ўпрыгожанні першых літар у тэксце інвентара з'яўляюцца ўдалымі архітэктурнымі фантазіямі XVII ст. на тэму "горад сучасны і горад будучы".

*Літаратура:*

1. *Чантурия, Ю. В. Градостроительное наследие Беларуси второй половины XVI – первой половины XIX в. / Ю. В. Чантурия. – Минск : Белорус. наука, 2005. – 375 с.*
2. *Інвентар маёнтка Карэлічы. 1672 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – КМФ № 5. – Воп. 1. – Спр. 1797.*
3. *Інвентар Карэліч і фальваркаў. 1646 г. // НГАБ. – КМФ № 5. – Воп. 1. – Спр. 1795.*
4. *Якимович, Ю. А. Зодчество Белоруссии XVI – середины XVII в. Спр. пособие / Ю. А. Якимович. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 368 с.*
5. *Федорук, А. Т. Старинные усадьбы Беларуси. Кореличский р-н / А. Т. Федорук. – Минск : Беларусь, 2013. – 174 с.*
6. *Шматаў В. Ф. Графіка / В. Ф. Шматаў // Гісторыя беларускага мастацтва. Т. 2. Другая палова XVI – канец XVIII ст. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – С. 166–178.*

**THE CONTEMPORARY AND FUTURE TOWN (ACCORDING TO KORELICHI INVENTORY OF 1672)**

**Sergachev S.A.**
**Belarusian National Technical University**

The analysis of Korelichi inventories of 1672 a district center of the Grodno region, and then possession of the Radzivills, depicts the typical process of development of Belarusian architecture of that time and features peculiar to this town. At the same time inventory itself is a work of art, which in the usual medieval manner shows the image of the town at the time and the view of the town of Korelichi in the future in the artist's Korelichi.

*Поступила в редакцию 08.02.2016 г.*

УДК 72.07

# ГЕНЕРАЦИЯ И ТРАНСФЕР ПРОФЕССИОНАЛЬНЫХ ЗНАНИЙ В РОССИЙСКО-СОВЕТСКОЙ АРХИТЕКТУРЕ

**Топчий И.В.**
кандидат архитектуры, директор подготовительных курсов ФБГОУ ВПО,
Московский архитектурный институт (государственная академия)

*Современная образовательная парадигма персонифицирована и переносит ответственность за принятие решений на отдельные личности. Автор статьи проводит историко-логический анализ способов получения профессиональных знаний на примере российско-советской архитектуры, их переноса, накопления и генерации. Современный зарубежный опыт дает понимание тенденции в организации профессионального сотрудничества, накопления новых знаний и решения национальных проблем в архитектуре и градостроительстве.*

*Введение.* В 2013 году, оценивая приоритеты современного общества, академик Е.М. Примаков отмечал, что «идеи дороже денег, на первый план выходит человеческий капитал». С этим необходимо согласиться, учитывая, что современная парадигма в образовании является личностно ориентированной, отводящей центральное место при принятии решений и ответственности за них самому человеку.

*Основная часть. Смыслы и ценности архитектуры с позиции современных архитекторов.* Архитектура, чаще воспринимается архитекторами - практиками, теоретиками и критиками, не как результат деятельности конкретного человека, отпечаток его личности и жизненного опыта, а как совокупность художественных, социальных, экономических и философских идей, направленных на преобразование пространственной среды. И архитекторы оценивают смыслы и цен-